У чым мая вера? (22)

Аўтар: Рэдакцыя
15.09.2013 01:00



Хрысціянская думка З партала fronda.pl

Вера абавязвае ў першую чаргу прытрымлівацца Дэкалогу, які з’яўляецца не толькі законам Божым, але і законам розуму. Каб атрымаць збаўленне, мы павінны любой цаной змагацца з нашымі слабасцямі... з пасткамі граху. Мы абавязаны няспынна навяртацца, выпраўляцца, працаваць над сабой. Мы былі пакліканы да святасці, але нам вядома, які цяжкі гэты шлях, бо ён вядзе праз цемру нашых він, і толькі вера можа дапамагчы нам знайсці праменьчык святла – надзеі ў цёмным тунэлі. Мы не можам саромецца сваёй веры... мы павінны паказваць усім нашае шчасце, звязанае з блізкасцю Хрыста.

З моладзевага форуму

Для мяне сапраўдная вера заключаецца ў словах: “Бласлаўлёныя, якія не бачылі, а паверылі”. Цяжка напісаць, чым для мяне з’яўляецца сапраўдная вера. Я ведаю, што мой Пан са мной. З Ім я ўсё магу, з Ім усяго дасягну!

З партала cognizant.com

Аб веры мы сведчым не толькі словам, але і ўчынкам. Свядомае і шчырае перажыванне святой Імшы, прыняцце сакрамантаў, непарушная любоў да Бога і бліжняга, якая плыве з глыбіні сэрца, а таксама міласэрнасць – усё гэта прыбліжае нас, хрысціян, да Бога. Згодна са словамі, заключанымі ў Пасланнях св. Яна: “Вера, калі не мае ўчынкаў, сама па сабе мёртвая”.